Ба 61443
Бә 61443



Б2 61445
С. А. Г. Б.
267493
891.72
128

ЯНКА МАЎР

# ПЕКЛА

БАЙКА

БЕЛАРУСКАЕ ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА
МЕНСК — 1929

Дзяржаўная бібліятэка ім. Леніна БССР

# ЗЬМЕСТ


*Стар.*

Папярэдняя заўвага . . . . . . . . . . 3
I. Як піонэры шукалі дарогу ў пекла . . . . . 5
II. Ля перавозу . . . . . . . . . . 9
III. У вагоне . . . . . . . . . . . 14
IV. Чысьцец . . . . . . . . . . . 19
V. На парозе да пекла . . . . . . . . 25
VI. Пекла . . . . . . . . . . . 28
VII. Гармідар у пекле . . . . . . . . . 34
VIII. Канстытуцыя П.Е.К.Л-а . . . . . . . 39


23. 04. 2009


Заказ № 550. У ліку 5.000 экз. Галоўлітбел № 2662.

Друкарня Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва

## ПАПЯРЭДНЯЯ ЗАЎВАГА.

Усе мы ведаем, якое значнае месца ў жыцьці народу займаюць чэрці, пекла і розныя падобныя рэчы. Вы не пражывеце аніводнага дня бяз чорта; а калі часам забудзецеся пра яго, дык хто-небудзь напэўна ўспомніць вам.

Калі хто моліцца богу, дык усё гэта робіцца толькі праз чорта. Каб яго, праклятага, ня было, дык ня трэ' было-б і богу маліцца. Дзеля чаго тады маліцца? Толькі страх перад чортам прымушае маліцца богу. Выходзіць, такім чынам, што сам чорт працуе на карысьць богу. А кажуць яшчэ, што чорт ідзе супроць бога!

Вылічана, што адзін толькі наш народ (у СССР) выдае на гэтую справу столькі, колькі выдаецца на ўсе школы. Апрача таго, марнуе, прынамсі, 1.500.000.000 рабочых дзён (1.500 мільёнаў!).

Во колькі зьядаюць чэрці!

А тымчасам кажуць, што ніякіх чартоў няма, што ўсё гэта выдумана, што ніхто ніколі ня бачыў іх і г. д. Ці-ж можа так быць? Ці-ж можна, каб мільёны людзей верылі ў тое, чаго зусім няма на сьвеце?

Таму мы захацелі вывучыць гэтае пытаньне дасканала.

І што-ж вы думаеце? Павінны былі пераканацца, што і чэрці, і пекла існуюць.

Бо знайшлі шмат друкаваных кніжак, дзе гаворыцца пра чартоў і пекла. А як-жа ж ня верыць друкаваным кніжкам? Гэтак, барані божа, можна ня даць веры і нашай кніжцы.

Галоўная літаратура наконт пякельных спраў—біблія, эвангельле, талмуд, коран і тысячы іншых рэлігійных кніг. Але... усе яны нейкія блытаныя, незразумелыя, нібы пісаў іх п'яны ці няпрытомны чалавек. Тлумачыцца гэта тым, што пісаны яны надта даўно, 1—3 тысячы год назад.

Ёсьць яшчэ славутая кніга вядомага італьянскага поэты Дантэ— «Боская комэдыя». Ён так дасканала апісаў той сьвет, што яго кнігу і цяпер вывучаюць у розных унівэрсытэтах. Але і ў яго кнізе пекла апісана такім, якім яно было 600 год назад.

Знайшлі мы і некалькі пазьнейшых кніжак, але вельмі ненадзейны народ пісаў іх: усё нейкія цёмныя манахі ды манашкі. Самая апошняя з іх—манашка Тэкля, якая была ў пекле 5 студзеня 1905 году [1]), дык нават зусім была няпісьменная і, нам здаецца, яна Дантэ і ўпадноскі не гадзіцца.

Наконт апошняй кнігі нават і нас узяло сумненьне, ці не наблытала крыху паважаная Тэкля? У 1905 годзе яна апісвае пекла таксама як апісвалася яно тысячы год назад. Ці-ж можа гэтак быць? Ці можна дапусьціць, што ў працягу тысяч год у пекле не адбылося аніякіх зьмен?

Калі заснавалася пекла на зямлі, паводле бібліі, было два чалавекі: Адам і Ева. Потым, на працягу шмат гадоў, народ мог налічваць дзесяткі, сотні тысяч чалавек, некалькі мільёнаў, а цяпер мы маем ужо каля двух мільярдаў.

Можна сабе ўявіць, якая павінна быць розьніца паміж колькасьцю людзей у пекле тады і цяпер!

А калі прымем яшчэ пад увагу, што цяпер народ наогул сапсаваўся і мала хто імкнецца ў рай, што цяпер толькі за адну гадзіну на зямлі паміраe каля 5.000 чалавек,—тады мы (вядома, толькі прыблізна) зможам прыкінуць, што ў першыя стагодзьдзі ў пекле магло быць некалькі дзесяткаў тысяч чалавек, а цяпер, прынамсі—25.000.000.000.000 (25.000 мільярдаў!).

Тымчасам, як колькасьць чарцей, якія павінны абслугоўваць пекла, засталася тая самая, што і спачатку. Згодна з падлікамі духоўных спэцыялістых, чарцей у пекле 1.405.928 штук,—ні больш, ні менш. Ды, апрача таго, 72.000 чартоўскіх князёў, графоў, баронаў ды іншых паноў [2]).

Гэта значыць, што калі раней аднаму чорту прыходзілася мардаваць, скажам, 10 чалавек, дык цяпер ужо прыходзіцца—17.000.000!

У гэткай справе сам чорт нагу зломіць!

Ну, падумайце цяпер самі, ці можна дапусьціць, што пякельныя ўмовы засталіся якраз такія самыя, што раней?

І вось, нарэшце, нам пашанцавала знайсьці сьведак, якія далі самыя апошнія, самыя верныя весткі пра пекла. Гэта—піонэры 219 атраду, 3-га зьвяна, Янка Пук і Юрка Шыш, якія трапілі ў пекла 13 чэрвеня 1926 году.

Іх весткі, бязумоўна, заслугоўваюць веры, бо адначасова адпавядаюць і рэлігійным кнігам, і сучаснасьці, і наогул розуму.

---

[1]) Кніга надрукавана ў Пецярбурзе ў 1911 г. і прагледжана профэсарам акадэміі А. Глаголевым.

[2]) Гэтыя лічбы ня выдуманы, а ўзяты з кніжкі І. М. Верына „Аб інквізыцыі" (інквізыцыя — суд духавенства, калі яно мардавала, душыла, паліла ўсіх тых, хто ня так верыў, як яны).

# І. ЯК ПІОНЭРЫ ШУКАЛІ ДАРОГУ Ў ПЕКЛА.

Янка Пук прышоў дадому вельмі позна.

— Ты дзе гэта цягаўся?—накінулася на яго маці.—Добрыя людзі ў царкву ідуць, а ты па сваіх клюбах бадзяешся, бязбожнік ты гэткі! Пачакай, трапіш ты за гэта ў пекла! Будзеш тады ведаць! Многа вас такіх там пакутуе!

Янка нічога не адказаў і пашоў спаць. Але заснуў ён ня скора.

— Вось,—думаў ён,—на кожным кроку мы ўсё чуем: пекла ды пекла. А што гэта за пекла, дзе яно—ніхто ня ведае. Здаецца, няма аніводнага чалавека, які-б там пабываў. Аднак, усе старыя разумныя людзі так упэўнена пра гэта кажуць, нібы добра ведаюць. Нават, як кажуць, і ўсе піонэры там зьбіраюцца і чамусьці пакутуюць. Не! Трэба сваімі вачыма паглядзець гэтае пекла ды, калі трэба будзе, дапамагчы сваім таварышом.

Гэтая думка цалкам захапіла яго. Раніцою ён зараз-жа пабег да свайго сябра Юркі і падзяліўся з ім сваімі думкамі.

Юрка быў зухаваты хлопец. Нядоўга думаючы, схапіў шапку і пашоў да дзьвярэй.

— Куды ты?

— Да пекла!—рашуча адказаў Юрка.

— Пачакай! Трэба-ж сабрацца, як мае быць. Узяць што-небудзь з сабой. Чорт яго ведае, якое будзе падарожжа!

Узялі хлеба, сала, зламаны ножык. Не забыліся і мыла, а то каля гэтых чарцей можна ўпэцкацца. Паклалі ўсё ў торбу і вышлі з дому.

Але куды ісьці? Вось задача!

— Каб на неба,—тады іншая справа: сеў на самалёт і валяй проста ў рай. А вось як пад зямлю пралезьці?

Пачалі пытацца разумных людзей.

— Дзядуля! Ці ня ведаеце, кудой прайсьці да пекла?—спыталіся яны старэнькага дзеда.

— ? а? Што?

— Да пекла кудой прайсьці?

— Да пекла? Ну, туды ўсе дарогі вядуць,—адказаў стары і пашоў далей. Зьдзівіліся хлопцы такім мудрым словам, але нічога не зразумелі.

Вось прышлі ў вёску. Ля царквы стаіць поп.

— Вось хто пакажа нам дарогу!—узрадваліся хлопцы.—Ён усе ходы і выхады ведае!

Падышлі, прывіталіся і далікатна пытаюцца:

— Бацюшка! Будзьце ласкавы, пакажэце нам дарогу да пекла.

У папа аж вочы павылазілі на лоб ад зьдзіўленьня.

— Бачыце,—казалі далей хлопцы,—нам трэба туды па справе, але ніхто ня можа паказаць дарогу. Апрача вас, бацюшка, нам ужо

няма да каго зьвярнуцца. Вы-ж маеце ўсе кнігі і пляны па гэтай справе.

Поп усё яшчэ ня мог апамятавацца. Нарэшце, ён перахрысьціўся і ціха запытаўся:

— Хто вы такія будзеце і адкуль?

— Мы—піонэры 219 атраду, 3 зьвяна, Янка Пук і Юрка Шыш.

Цяпер толькі заўважыў поп іхныя чырвоныя гальштукі і злосна крыкнуў:



Будзьце ласкавы, пакажэце нам дарогу да пекла.

— А! Вось вы хто такія! Ну, будзьце спакойны—у пекла вы напэўна трапіце. Вас там даўно ўжо чакаюць і нават месца прызначана.

— Мы так і думалі, што ўсё гэта вам вядома. Таму і пытаемся вас. Калі ласка, скажэце.

— Ды праваліцеся вы скрозь зямлю!—крыкнуў поп, махнуўшы рукой.

— Вось мы і шукаем такога месца, дзе можна было-б праваліцца скрозь зямлю!—лагодна сказаў Янка.

— Ідзеце вы к чарцям з сваімі дзёрзкімі пытаньнямі!—яшчэ раз крыкнуў поп і пашоў у хату.

Хлопцы паскраблі патыліцы.

— Вось дык фунт! Адсылае да чорта, а дарогі паказаць ня хоча!

Запыталіся яшчэ некалькі разумных людзей, але ўсёроўна не дабіліся толку.

— Ведаеш што?—сказаў тады Юрка.—Калі разумныя ня ведаюць, дык напэўна ведаюць дурні. Пойдзем шукаць дурняў.

Зайшлі да аднаго гаспадара.

— Дзядзенька! Скажэце, хто ў вас тут дурны?

Дзядзька падумаў крыху і кажа:

— Няма цяпер дурняў, дзеткі. Хіба зайдзеце да Сідара, на тым канцы жыве.

Прышлі да Сідара, зноў пытаюцца:

— Хто ў вас самы дурны?

— У нашай вёсцы бадай-што няма такіх. Хіба наведайцеся да Сьцяпана.

Сьцяпан-жа, пачухаўшы патыліцу, сказаў:

— Мусіць, гэта будзе Кандрат. Вунь яго хата.

Нарэшце, хлапцоў прыслалі ў тую самую хату, з якой яны пачалі.

— Ну, як? Ці знайшлі?—запытаўся гаспадар.

— Дзе там! Кожны шле да другога.

— Я-ж казаў, што няма цяпер дурняў на сьвеце.

Надыходзіў ужо вечар, і гасьцінныя гаспадары прапанавалі хлапцом пераначаваць у іх. Далі бульбы з малаком, паслалі на лаве. Хлопцы падзякавалі і зараз-жа палеглі спаць.

Вось чуюць яны, што гаспадар енчыць, нібы ў яго зубы баляць. Потым сьціх, войкнуў.

Зірнулі хлопцы—стаіць гаспадар каля печы і трымае ў руцэ свой вырваны зуб. Потым пачаў круціць гэтым зубам вакол галавы і мармытаць: «Мышка, мышка, на табе касьцяны зуб, дай мне жалезны»,—і кінуў свой зуб на печку.

— Слухай!—штурхануў Юрка Янку.—Гэты напэўна ведае!

— Ці ведаеце вы, часам, дарогу да пекла?—зараз-жа запытаў Янка.

— Чаму-ж не?—спакойна адказаў дзядзька.—Трэба ўначы пайсьці проста ў лес, потым завярнуць направа, потым налева, далей зноў направа, тады зноў налева і яшчэ раз налева. Там сярод вялікіх каменьняў стаіць стары дуб з шырокім дуплём. Трэба дачакацца поўначы, і тады можна лезьці ў дуплё—вось вам і дарога. У даўнейшыя часы адтуль заўсёды чэрці вылазілі; толькі цяпер іх чамусьці ня чуваць.

Не пасьпеў ён скончыць сваіх слоў, як ужо хлопцы былі ля дзьвярэй.

— Дзякуем вам! Бывайце здаровы!—сказалі яны.

— Куды вы?

— Да пекла!—разам адказалі хлопцы.

— Ах, дзеткі мае! А што-ж вы надумаліся? Загубіце вы свае душы!—загаласіла добрая гаспадыня, але хлопцы былі ўжо на вуліцы.

Пашлі яны ў лес; заварочваюць направа—налева, як казаў дзядзька. Цёмна, жудасна навокал; совы крычаць. Урэшце, угледзелі каменьне і дуб з дуплём.

— Як-жа ж цяпер даведацца, якая гадзіна? Трэба, каб было дванаццаць,—сказаў Юрка.

— Залезем у дуплё і будзем сабе спаць, пакуль адчыняцца дзьверы да пекла,—прапанаваў Янка.

Так і зрабілі. Суха, цёпла там было, і яны пачалі ўжо драмаць, як зямля раптам праваліласяі—і яны паляцелі ўніз.

Хоць ня хочацца сароміць нашых герояў, але мусім прызнацца, што хлопцы ад перапуду аж закрычалі—«мама!»

Але нічога дрэннага ня здарылася. Праваліліся яны няглыбока. Глядзяць—звычайная яма, толькі з аднаго боку відаць цёмная дзірка. Прапаўзьлі некалькі крокаў і вылезьлі ў нейкую вялікую залю. Пасярэдзіне булькала крыніца, зьверху капала вада.

Але самае прыгожае было—гэта вапенныя нацёкі, што зьвешваліся зьверху, як лёд са страхі. Такія самыя нацёкі вельмі часта бываюць у падземных пячорах. А на сподзе тырчалі накапкі, такія самыя нацёкі, толькі канцамі ўгору.

— Можа гэта і ёсьць пекла?—сказаў Юрка.

— Ня можа быць,—адказаў Янка.—Па-першае, яно вельмі блізка ад зямлі, і ўсе душы маглі-б уцячы. А па-другое, тут няма нічога. Пойдзем уздоўж ручая, ён напэўна куды-небудзь ды завядзе.

Пашлі далей. Раптам ручай увайшоў у дзірку, так што над вадой засталася толькі невялікая шчыліна.

— Вось дык няўдача! Што-ж будзем рабіць далей?— прамовіў Янка.

— Ды пойдзем далей, хоць у пекла!—крыкнуў Юрка.—Некуды-ж цячэ вада? Некуды трапім і мы.

Увайшлі ў ваду і ледзь не закрычалі ад холаду. Добра яшчэ што яны, як сапраўдныя піонэры, заўсёды мыліся халоднай вадой і прызвычаіліся да гэтага.

Брысьці прышлося так, што толькі галава была над вадой, дый то краталася да столі. Потым зноў вышлі ў шырокую залю.

Тут Юрку ўзяло сумненьне:

— Пачакай!—сказаў ён.—Як вядома, да сярэдзіны зямлі 6.000 кілёмэтраў. Ці здолеем мы прайсьці гэткі шлях?

Зьбянтэжыўся і Янка.

— Гэта праўда,—сказаў ён.—Але не вяртацца-ж нам назад? Пакуль можна, трэба ісьці. Павінен-жа ж недзе быць галоўны шлях, кудой усе ідуць? А там паглядзім.

Зноў рушыліся. Пячора рабілася ўсё вузей і вузей і, урэшце, перад імі засталася толькі невялікая шчыліна, праз якую яны ледзь маглі-б пралезьці.

Зірнулі туды—і ахнулі!..

Перад імі разгарнулася шырокая рака. Па беразе яе ішла даканалая шаша, скрозь выбрукаваная «добрымі пажаданьнямі». І па гэтай дарозе з абодвух бакоў валіў народ. Усе яны ішлі да перавозу, дзе клапаціўся нейкі дзед у лодцы.

Мігам працісьнуліся хлопцы праз шчыліну і далучыліся да людзей.

## II. ЛЯ ПЕРАВОЗУ.

Ля перавозу стаяў шум, гам, лаянка. Усе ціскаліся, штурхаліся, скакалі, каб толькі хутчэй трапіць у лодку.

Пакуль хлопцы падышлі, лодка ўжо адплыла, і ім прышлося чакаць на беразе.

Тут яны заўважылі аднаго паважанага дзядзьку ў акулярах. Прыгледзеліся—і пазналі аднаго вядомага вучонага, портрэт якога нядаўна бачылі ў «Беларускім Піонэры».

— І вы тут?—зьдзівіліся хлопцы.—Што-ж вы такое дрэннае зрабілі?

— Я вынайшоў лекі ад вялікай хваробы,—усьміхнуўшыся, адказаў профэсар.

— Дык за гэта вас у пекла на пакуту?

— Не за гэта, а за тое, што я сам знайшоў, бяз бога. За тое, што я ў яго ня веру і не маліўся. А вы, як сюды трапілі? Вы здаецца, жывыя?

— Жывыя. Мы—піонэры 219 атраду, 3 зьвяна, Янка Пук і Юрка Шыш. Прышлі паглядзець, што тут робіцца і дапамагчы сваім таварышом.

— Малайцы!—сказаў профэсар.—Вы, напэўна, здолееце ўсім дапамагчы. Бо вы жывыя, а чэрці з жывымі нічога ня могуць зрабіць, бо яны маюць уладу толькі над мёртвымі душамі.

— А што гэта за рака?

— Стыкс[1],—адказаў профэсар:—На тым беразе ўжо царства чарцей, хаця-ж да самага пекла яшчэ 5.460 кілёмэтраў.

— А як туды трапіць?

— Па чыгунцы. Нядаўна пабудована. Раней-жа вельмі цяжка было. Бо ні старадаўныя людзі, ні чэрці ня ведалі аб гэтай справе. Але цяпер, як угледзелі, што людзі там наверсе пабудавалі чыгункі,

[1]) Рака Стыкс, перавозчык Харон, Ахілес ды іншыя імёны ўзяты з старажытнай гісторыі. Наогул трэба мець на ўвазе, што ўсе факты поўнасьцю адпавядаюць таму, як вучаць і старажытныя, і сучасныя рэлігіі.

тады і чэрці зрабілі. А цёмны народ там на зямлі і да гэтага часу ня ведае, лічыць, што чэрці і цяпер таксама жывуць, як тысячы гадоў назад. Я чуў, што чэрці нават крыўдзяцца, калі іх лічаць такімі дурнымі.

Народ тымчасам усё падыходзіў ды падыходзіў. Многія сустрэлі знаёмых, пачалася гутарка.

— Сяргей! Якім чынам ты тут апынуўся?—запытаўся свайго таварыша 20-гадовы комсамолец Мікола.

— Забілі мяне,—адказаў Сяргей.

— Хто? За што?

— Быў я селькорам, выявіў аднаго падлюгу,—ён падпільнаваў і стукнуў з абрэзу. А ты як?

— Бандыт забіў,—адказаў Сяргей.

Пачуўшы такую размову, хлопцы вельмі зьдзівіліся.

— Чаму-ж гэта вас у пекла на пакуту, калі вы нічога дрэннага не зрабілі? Ды яшчэ вас забілі!

— Эх, хлапчукі!—адказаў Сяргей.—Адразу відаць, што вы закону божага ў сваіх школах ня вучыліся. Мы-ж не маліліся, на споведзі ня былі. А вось той, хто мяне забіў, той проста ў рай трапіў.

— Як гэта так?!—крыкнулі піонэры.

— Вельмі проста. Яго арыштавалі, прысудзілі да расстрэлу. А ён паклікаў папа, пакаяўся, спавядаўся, прычасьціўся—і цяпер у раі з сьвятымі гуляе.

— Мой бандыт таксама зрабіў,—дадаў Мікола.

Піонэры толькі дзівіліся.

— Што гэта такое? Значыцца, такім чынам, усе жулікі, зладзеі, разбойнікі пойдуць у рай, а добрыя людзі—у пекла?

— Выходзіць так,—засьмяяўся Сяргей.

— Ну, а я лепш згодзен з добрымі хлапцамі быць у пекле, чым з тым хаўрусам у раі,—сказаў Мікола.

— Праўда! Правільна!—закрычалі з розных бакоў.

Раптам пачуўся дзіцячы голас:

«Жура-жура-жура-журавель,
Журавушка мала-ды...».

Усе азірнуліся—і бачаць: ідзе сабе па беразе шасьцігадовы пацан, трымае на плячы кій і пяе на ўсё горла, быццам яму сам чорт ня брат.

— Хлопчык, хто ты? Адкуль? Як трапіў сюды?

— Я—акцябронак, з атраду «Верабей»,—з гонарам адказаў карапуз.—Захварэў на шкарлятыну, потым паправіўся і прышоў сюды,—і пашоў сабе далей, хоць-бы што.

— Гаротны, ён нават яшчэ ня ведае, што памёр,—спачувалі жанчыны.

Тут падышоў адзін малады яўрэй. Зараз-жа яго абкружылі і пачалі пытацца.

— А ты чаго сюды? Які закон ты ня выканаў? Ці-ж вы ў гэтае самае пекла ідзеце, што і мы?

— А што-ж ты думаеш, для кожнага асобнае пекла будуць будаваць?—адказаў яўрэй.—Дорага будзе каштаваць, не забывайцеся аб рэжыме эканоміі.

Усе навокал зарагаталі.

— Які-ж ты закон ня выканаў?—зноў запытаўся Сяргей.

— Ці мала ў нас гэтых законаў? Ну, напрыклад, я бяз шапкі ў сынагозе стаяў перад богам.

— А мяне сюды паслалі за тое, што я ў шапцы ў царкве стаяў перад богам!—крыкнуў адзін чалавек.

Зноў зарагаталі.

Хлопцы зусім зьбіліся з панталыку.

— Дзядзенькі! Як-жа ж гэта так? Мы нічога не разумеем!

— І не зразумееце!—адказаў Мікола.—Ніхто не зразумее, нават сам чорт нічога не разьбярэ.

У гэты момант падышоў адзін татарын. Плача, енчыць, ломіць рукі.

Усе да яго.—Чаго ты? Ці-ж ты адзін? Не бядуй, добра будзе; тут сабраліся слаўныя хлопцы.

Татарын-жа ўсё лемантаваў:—Ой-ой-ой! Ашукалі, праклятыя!

— Хто ашукаў? Як ашукаў?

— Ды яны ўсе, мулы ды ўсякія там чэрці. Казалі, што наша вера найлепшая, праўдзівейшая. Што наш Алах—найлепшы бог, што другія богі—ні чорта ня варты. Што і рай, і пекла—у нас зусім асобныя, лепшыя. А цяпер выходзіць, што і ваш, і наш бог—адзін чорт, і ўсіх садзіць у адно пекла. Ой-ой-ой!

— Позна адумаўся,—сьмяяліся душы.—Захацеў асобнага, лепшага пекла! Пасядзі з намі.

Таксама неспадзявана былі зьдзіўлены і іншыя «чужаземцы»: кітайцы, індусы, манголы і шмат іншых. Усім ім казалі, што і бог, і вера, і рай, і пекла—усё ў іх асобнае, лепшае.

Але былі і такія, як, напрыклад, нэгры, папуасы, готэнтоты, індзейцы, якім казалі, што пекла—нейкая яма з жабамі і зьмеямі, і тое, што яны цяпер убачылі, ім нават спадабалася. Так цікава, весела, столькі рознага народу са ўсяго сьвету,—і аніводнай жабы!

Тымчасам вярнуўся перавозчык. Гэта быў высокі худы дзед, толькі скура ды косьці, з доўгай белай барадой і сівымі валасамі.

— Гэта Харон,—растлумачыў профэсар,—пахаджэньнем з Грэцыі. Ён ужо 4.000 гадоў перавозіць мёртвыя душы.

Стары быў пануры, сярдзіты і ўвесь час лаяўся.

— Ну, сядайце хутчэй, ды ня штурхайцеся, каб вас усіх чорт забраў! Аніводнай хвіліны адпачыць ня можна з-за вас, паганых! Пруць і пруць з кожным днём усё болей і болей! І адкуль толькі бярэцца столькі народу? Чаму раней гэтага ня было? І чаму гэта ў

рай ніхто ня хочаісьці? Дык не, усе лезуць у пекла, кожны хоча сюды трапіць,—бы на мёд! Куды ты прэш, каб цябе? Пачакай, пасьпееш!— крыкнуў ён на адну жанчыну і замахнуўся на яе вяслом.

Народ ціскаўся, душыўся, штурхаў адзін аднаго, лодка калыхалася і, здавалася, вось-вось перакуліцца.

Харон лупіў вяслом направа і налева.

— Куды? Каб табе на тым сьвеце прыпякло!

— Дзядуленька! Мяне пусьці, мой тэрмін прайшоў!—насядалі душы.

— А дзе ты валачыўся да гэтага часу? А? Вось цяпер і чакай. А ты зноў? А каб цябе Цэрбэр разадраў!

Можа хто з чытачоў ня ведае закону, тады трэба сказаць, што душа пасьля сьмерці чалавека мае тры дні ільготных, калі яна можа вольна вандраваць па сьвеце. А хто заваландраваўся, прапусьціў тэрмін, той цяпер і сьпяшаўся, ціскаўся.

Праціснуліся і хлопцы. Лодка кранулася.

Цяжка было старому Харону везьці паўнюсенькую лодку па хуткай рацэ. Ён кашляў, задыхаўся, пот ліўся з яго струменьнем, і ён увесь час пакрыкваў:

— Сядзеце спакойна, чэрці паласатыя! Не пераважвайцеся на адзін бок! Лодку перавернеце, каб вам перавярнула кішкі! Вось кара боская! Што-ж гэта далей будзе? І адкуль толькі яны бяруцца на маю галаву? Зморыць яны ня толькі мяне, але ўсіх чарцей у пекле!

Глянулі хлопцы на ваду. Яна была чорная, халодная і нават нібы густая.

— Цікава-б было пакупацца ў ёй; мы ні разу ня купаліся ў такой рацэ.

— Ах, добра, што ўспомнілі,—сказаў профэсар.—Магу вам даць вельмі карысную раду. Вы абавязкова пакупайцеся ў гэтай рацэ. Тады вам ніхто ня зможа пашкодзіць. 3.000 гадоў назад тут адна матка выкупала свайго сына, Ахілеса. Але, як яна, купаючы, трымала яго за пятку, то гэтая «Ахілесава пята» і засталася ў яго адзіным бясьпечным месцам. Потым яго забілі толькі таму, што трапілі стралой якраз у гэтую пятку. Затое вы ўжо пастарайцеся выкупацца цалкам.

— Вельмі вам дзякуем, профэсар!—абрадваліся хлопцы. — Вось гэта нам будзе якраз дарэчы!

Як толькі лодка прыстала да берагу, яны зараз-жа пабеглі купацца.

Харо аж аслупянеў.

— Што гэта вы надумаліся, га? Хто вам дазволіў? Нельга тут купацца! Надоечы нейкая шалёная баба прыходзіла купаць сваё дзіцянё, а тут вось яшчэ знайшліся хуліганы. Прэч, а то я вас!..—і ён замахнуўся вяслом.

Але хлопцы ўжо далі нырца.

Калі яны паказаліся з вады, Харон перацягнуў такі іх вяслом па галаве. Але дармо ўжо. Яны нават не пачулі ўдару.

— Ур-р-а-а!—зараўлі абодва.—Хай жывуць непераможныя піонэры! Цяпер мы задамо такога перцу, што ўсім чарцям млосна будзе!



Харон перацягнуў такі іх вяслом па галаве.

— Ах, вы, чарцяняты!—бурчэў Харон.—Пасьпелі ўжо!

Тады хлопцы падышлі да яго бліжэй.

— Дзядуля!—ласкава зьвярнуўся Юрка.

— Чаго вам яшчэ?—буркнуў Харон.

— Вы водпускам калі-небудзь карысталіся?

— Які тут водпуск!—махнуў рукой Харон.—Чатыры тысячы гадоў важу дзень і ноч, бяз жаднага перапынку.

— Дык вы кіньце працу.

— Як гэта?—зьдзівіўся Харон.—А перавозіць хто будзе?

— Ды ніхто. Вы патрабуйце, каб мост пабудавалі. Бачыце, сабе яны дык чыгунку пабудавалі, а вам і маста ня хочуць. А тады вам зусім ня трэба было-б працаваць, самі хадзілі-б. Кіньце працу і тады ўбачыце, што яны павінны будуць вам мост пабудаваць.

Хлопцы сабе пашлі, а Харон пачаў разважаць:

— Але, праўду кажуць гэтыя чарцяняты! Што я ім мільён гадоў павінен без перапынку працаваць, ці што? Хай будуюць мост! Ня буду больш вазіць!

Кінуў вясло і расьцягнуўся на зямлі.

Так прыемна было старому адпачыць пасьля 4.000 гадоў бязупыннай працы!

## III. У ВАГОНЕ.

Станцыя была звычайная, як і ў нас. Бо будавалі яе тыя самыя рабочыя і інжынэры, якія былі прысланы сюды на пакуту. Нават і цяпер ніжэйшыя пасады займалі тыя з нашых чыгуначнікаў, якія на зямлі п'янствавалі, лянаваліся працаваць і праз якіх здарыліся катастрофы.

Вядома, пасажыраў было шмат, толькі бяз клункаў. Цягніка яшчэ ня было.

Па пляцформе хадзіў начальнік станцыі, высокі, тоўсты чорт, з казьлінай бародкай і казьлінымі капытамі. Рогі яго былі закрыты форменнай шапкай. Доўгі хвост быў засунуты за пояс[1]). Далей сталі два чарты-ахраньнікі з віламі на плячах і пакурвалі чортава зельле.

— Дык вось яны якія, гэтыя чэрці!—сказаў Юрка.—Зусім ня страшныя. Пойдзем запытаемся, ці скора цягнік.

Падышлі. Але ўсё-ж такі жудасна было першы раз у сваім жыцьці загаварыць з самым сапраўдным чортам. А чорт яго ведае, як да яго зьвярнуцца?

— Та... таварышы чэ-чэ...рці, ці скора будзе цягнік?—прагаварыў Янка.

— Праз поўгадзіны,—спакойна адказаў чорт.

— Праўду кажуць, што ня так страшны чорт, як яго малююць,—разважалі піонэры, адыходзячы.

Тымчасам нейкі селянін прычапіўся да начальніка станцыі.

---

[1]) Пры выкананьні сваіх службовых абавязкаў чэрці заўсёды павінны так трымаць свой хвост.

— Пане начальнік! Я, далібог, ня вінен. І ня думаў нават, але чорт наблытаў. Выпілі мы, значыцца, з Кузьмой самагону...

— Ды кажу-ж я табе, што гэта не мая справа! Там разьбяруць. Мяне гэта зусім не датычыцца,—нецярпліва сказаў чорт.

— Як-жа ж гэта так?—не адыходзіў чалавек.—Я-ж зусім не вінаваты. Выпілі гэта мы, значыцца, з Кузьмой самагону, а ён ча-



По пляцформе хадзіў начальнік станцыі.

госьці пачаў лаяцца: ты, кажа, чортава твая душа, думаеш, што я цябе баюся?—ды плясь мне ў морду. Я ня стрымаўся. Ах, кажу, ты, сьляпы чорт!..

Начальнік зусім раззлаваўся.

— Ідзі ты к чорту!—крыкнуў ён, тупнуўшы капытом.—Чаго прыстаў, як зараза? А то загадаю, каб пасадзілі цябе ў паравозную печку!

Чалавек адышоўся, але доўга яшчэ бурчэў:—Як-жа ж гэта так, калі я зусім не вінаваты?..

Насустрач трапіўся поп. Хлопцы зараз-жа зьвярнуліся да яго, каб высьветліць адно пытаньне:

— Скажэце, калі ласка, бацюшка, чаму гэта людзі самі сьпяшаюцца ў пекла? Ніхто іх ня цягне і ня гоніць, ніхто не стаіць за іх каркам, а яны нават з гвалтам пруць у пекла.

— Бачыце,—адказаў поп,—пасьля сьмерці душа траціць сваю волю; ня гледзячы на свае жаданьні ці нежаданьні, яна павінна ісьці туды, куды прызначана. Хаця-ж д'яблы як-быццам іх і ня цягнуць, але ўсёроўна душы знаходзяцца ў іхнай уладзе.

— Ї вы таксама, бацюшка?—запытаўся Юрка.

Але поп прыкінуўся, быццам не пачуў, і адышоўся далей.

Тут праціснулася паміж людзей нейкая баба, падышла да папа і— цмок яму ў руку.

— Памалецеся за мяне, сьвяты айцец!—зашчабятала яна.—Саграшыла я перад госпадам-богам: у вялікі пост зьела мяса. Праўда, гнілога, але ўсё-ж такі мяса. Ох, грахі нашы цяжкія!

Поп пачырванеў, адвярнуўся і пастараўся ад яе схавацца.

Пачуўся грукат, потым гудок. Усе замітусіліся. Вось пабег стрэлачнік (з людзей).

— Ты чаго не на месцы?—крыкнуў чорт-ахраньнік, ды віламі яго ў бок.

— Ого!—ускрыкнулі хлопцы.—Усё-ж такі відаць, што пекла!

З тунэлю, бы вецер, вылецеў цягнік і спыніўся перад станцыяй. З вагонаў вышлі кондуктары-чэрці. З паравознай будкі выглянуў машыністы, увесь чорны, як чорт. Публіка кінулася ў вагоны.

Штурхатня, крыкі, лаянка. Дужэйшы адпіхваў слабейшага. Умяшалася ахова і пачала садзіць свае вілы ва ўсе бакі.

Вось па пляцформе бегае двухгадовае дзіцянё, плача, крычыць: «мама».

Чорт ахраньнік падчапіў яго на вілы і ўкінуў у вакно вагона.

— За што-ж такіх яшчэ мардуюць?—вырвалася з грудзей хлапцоў.

Старэнькі добрадушны чорт-кондуктар растлумачыў ім, што гэта няхрышчонае дзіцянё, што бацькі яго акцябрылі і нават імя далі нейкае нялюдзкое—Чыжык.

— Ну, тады хай бацькі і адказваюць!—запротэставалі хлопцы.— Чым-жа ж вінавата такое дзіцянё?

— Нічога ня зробіш,—уздыхнуў чорт.—Такі ўжо боскі закон.

Тымчасам далі званок, а піонэры ніяк не маглі ўціснуцца ў вагон. Палезьлі яны на буфэры, але там стаяў вялікі тлусты манах і ня пускаў.

— Ага, праклятыя піонэры!—крычаў ён. Вось і вы трапілі, куды вам належыць, па заслугах! Будзеце цяпер ведаць, як сьмяяцца з бога і рэлігіі! Будзеце ведаць, як дурыць добрых людзей!

— Айцец сьвяты!—насьмешліва сказалі хлопцы.—А самі вы як сюды трапілі?

— Ну, гэта ня ваша справа, малакасосы,—агрызнуўся манах.

Бомкнуў новы званок. Піонэры раптам ухапілі манаха за абедзьве нагі. Той і вохнуць не пасьпеў, як апынуўся пад вагонам. Хлопцы ўскочылі на яго месца,—і цягнік пашоў.

— Малайцы, хлопцы!—крыкнуў комсамолец Сяргей, які бачыў усю гэтую сцэну.

Цягнік нырнуў у тунэль і паляцеў з хуткасьцю 600 кілёмэтраў у гадзіну. Хлопцы праціснуліся ў сярэдзіну вагона і знайшлі там сваіх знаёмых: профэсара, селькора ды інш.

— Ну, што, падабаецца вам падарожжа?—запытаўся профэсар.

— Вельмі цікава,—адказаў Юрка.—Асабліва мы ўдзячны вам за вашу раду. Мы ўжо спрабавалі чартоўскіх вілаў—і нічога.

Народ у вагоне тымчасам разьмясьціўся, сьціснуўся і прыціх. Відаць было, што кожны думаў аб сваім будучым лёсе. Некаторыя нават пачалі плакаць. Толькі дзеці дурэлі, як і на зямлі. Паміж іншым хлопцы зьвярнулі ўвагу, што сярод пасажыраў ня відаць паноў: усё працоўны народ. Яны запыталіся профэсара, чым гэта тлумачыцца.

— Праўда,—адказаў профэсар,—багатых тут знойдзецца можа адзін на мільён, і справа вельмі простая: калі бядняк памрэ, хто будзе за яго маліцца? Ён нават часьцей за ўсё і спавядацца не пасьпее. А багаты, калі дасьць грошы цэрквам, папом, манастыром, жабраком, дык за яго дзень і ноч маленьне ідзе. Ёсьць нават такія,—і іх большасьць,—якія самі і маліцца ня ўмеюць, і ў бога ня вераць, а ідуць у рай, бо яны могуць наняць ня толькі шмат папоў, але нават архірэяў. А калі ён яшчэ пабудуе якую-небудзь царкву, дык ужо зусім лічыцца амаль-што сьвятым. Вядома, што яны ўсе ідуць у рай.

— Вось бачыце!—стукнуў кулаком адзін дзед.—А чаму-ж нам казалі, што на тым сьвеце будзе наадварот: што багатыя пойдуць у пекла, а бедныя—у рай!

— А што-б ты рабіў, каб табе сказалі праўду?—запытаўся з верхняй паліцы чырвонаармеец.

— Ды я-б тады аніводнага дня не цярпеў!—крыкнуў стары.

— Ну, дык вось, каб ты цярпеў, табе так і казалі,—засьмяяўся чырвонаармеец.

— Гляньце, якая там цікавая кампанія!—сказаў адзін пасажыр.

Усе паглядзелі ў той бок, дзе ён паказваў, і ўбачылі сапраўды цікавую кампанію: ксёндз, поп і рабін сядзелі ў кутку, нібы браты, і ціханька гутарылі. Перад агульным няшчасьцем яны нават забыліся, што жылі, як кот з сабакам.

— Вы проста едзеце?—запытаўся рабін ксяндза.

— Проста,—уздыхнуў той.

— Чаму-ж так?—зьдзівіўся поп.

— Такі ўжо лёс,—зноў уздыхнуў ксёндз.

— Каб мець такое права, як вы,—з дакорам сказаў рабін,—ды ня выкарыстаць яго—гэта-ж сорам! Я-б на вашым месцы абавязкова паспрабаваў. Усёроўна горш ня будзе.

— А і праўду вы кажаце,—павесялеў ксёндз.—Трэба будзе спробваць.

Вось увайшоў нейкі жоўты чалавек, прыбраны нібы насьмех. Чаго толькі не начапляў ён на сябе! Клыкі зьвяроў, пер'е птушак, чарапашкі, каменчыкі нейкія, балванчыкі, нават каробачку ад консэрваў.

Ён падышоў да сьвятых айцоў і пачаў размаўляць з імі нібы з добрымі знаёмымі.

— Што гэта за пудала такое?—зьдзівіліся пасажыры.

— Супрацоўнік іхны шаман [1]),—сьмяючыся, сказаў профэсар.

— Ну, і кампанія!—гыгыкнуў зьверху чырвонаармеец.

Па вагону прайшоўся кондуктар.

— Каталікі, рыхтуйцеся!—крыкнуў ён.—Зараз вылазіць: станцыя Чысьцец!

— Што гэта азначае?—зьвесіў галаву чырвонаармеец.

— Вы хто такі?—запытаўся яго кондуктар.

— А чорт яго ведае!

— Ну, дык сядзеце і ня рыпайцеся! Гэта датычыцца толькі каталікоў,—абрэзаў кондуктар і пашоў далей.

Зноў дапамог профэсар.

— Бачыце,—сказаў ён,—зараз будзе станцыя «Чысьцец». Заснавана яна ў 1439 годзе, згодна пастановы зьезду каталіцкага духавенства ў Флёрэнцыі (Італія). Выклікана гэта тым, што ёсьць шмат людзей, якія не настолькі дрэнныя, каб іх пасылаць у пекла і не настолькі добрыя, каб садзіць у рай.

— Як кажуць, ні рыба, ні мяса!—уставіў чырвонаармеец.

— Во-во, праўда,—засьмяяўся профэсар.—Дык вось, для іх зроблены гэты «чысьцец», пасьля чаго яны ўжо трапляюць у рай.

— Вось якія яны хітрыя!—злосна сказаў чырвонаармеец.—А праваслаўныя, дык не падумалі пра нас.

— Ну, ведаеце,—сказаў профэсар,—і тут думалі не аб народзе, а аб сабе. Справа ў тым, што калі душа пападае ў пекла, дык усё скончана, ніколі яна адтуль ня вызваліцца. Значыцца, і маліцца за яе бескарысна. А калі душа ў «чысцу», дык усё залежыць ад таго, ці дужа будзе маліцца царква,—заўважце, царква, а ня прыватны чалавек. Ну, вось і плоцяць царкве за гэта ў працягу гадоў.

— Гэта называецца,—пабудова новага прыбытковага прадпрыемства,—дадаў чырвонаармеец.—А нашыя дурні і да гэтага не дадумаліся.

— Бо яны і без таго мелі вялікі прыбытак,—сказаў профэсар.—Адных дзяржаўных грошай колькі на іх трацілася! А цяпер, калі горш ім зрабілася, напэўна, што-небудзь прыдумаюць. Нездарма яны

[1]) Шаманы—духавенства ў дзікіх сібірскіх народаў.

дзеляцца на жывых, мёртвых, баптыстых, эвангелістых, духабораў, маланак, хлыстоў і г. д.

— Ой-ой! Што гэта за пляменьні такія?—крыкнулі хлопцы.

— Ды вашы-ж рэлігійнікі[1]). Хто прыдумае штуку хітрэйшую, той больш і заробіць.

— Як-жа ж бог разьбіраецца ва ўсіх іх?

— Ды ён ня надта і разьбіраецца. Яму што? Абы толькі яго шанавалі ды выконвалі свой закон.

— Гэтак кожны можа выдумаць сам сабе закон!

— Хай выдумляе. Але тады ўжо бог сочыць, каб гэты закон выконваўся.

Тымчасам цягнік спыніўся.

— А ці ня вылезьці і нам?—сказаў Янка Юрку.

— Вядома, варта!—падтрымаў профэсар.—Трэба азнаёміцца з усімі ўстановамі, каб расказаць людзям усю праўду.

Хлопцы разьвіталіся і вылезьлі з вагона.

## IV. ЧЫСЬЦЕЦ.

Маленькая станцыя стаяла сярод роўнага поля. Наколькі толькі магло ахапіць вока,—нідзе ні ўзгорку, ні дрэва. Шэрае цьмянае сьвятло вылучалася нямаведама адкуль і ствârала туманны змрок, як у нас часам бывае ўвосень. І нідзе аніводнай каляровай плямы.

Сярод гэтага поля нявысокай сьцяной была агароджана вялікая плошча. У сьцяне відаць была брама. Туды і накіроўваліся людзі.

Там вакол стала сядзела камісія, у якую ўваходзілі тры анёлы і тры чарты. Камісія пераглядала дакуманты.

Народ быў ціхі, сьмірны, аніякіх спрэчак, ніякай штурханіны. Але камісія чамусьці выглядала нібы зморанай. Анёлы сядзелі, як мокрыя куры, апусьціўшы свае крыльлі. Чэрці, старыя, аблезлыя, таксама сядзелі, павесіўшы хвасты.

Моўчкі, аднаго за адным, прапускалі прыежджых у сярэдзіну.

Падышла адна жанчына. Анёл паглядзеў яе дакумант, потым паказаў чорту.

— Ты ня туды трапіла! Цябе ў рай трэба!—зьвярнуўся анёл да жанчыны.

— Усёроўна,—адказала яна абыякім тонам.

---

[1]) Вось няпоўны сьпіс рэлігійных гатункаў, якія вядомы толькі ў адным СССР: баптыстыя, эвангелістыя, абнаўленцы, ціханаўцы, духаборы, малаканы, хлысты, суботнікі, васкрэсьнікі, скапцы, духаносцы, сапуны, скакуны, лазараўцы, відзенцы, штундыстыя, талстоўцы, стараверы, піліпаўцы, федасееўцы, аронаўцы, іаніты, паморцы, нетаўцы, папоўцы, беспапоўцы, беглапапоўцы, аўстрыйцы, воздыханцы, страньнікі, самахрышчэнцы, пашкоўцы, спасаўцы, дзірнікі, немалякі, шалапуты, стрыгольнікі, людзі божыя, данцы, штунда-баптыстыя, млада-штундыстыя, маляванцы, нова-хлыстоўцы, сютаеўцы.

Паглядзеў анёл на чорта.

— Што-ж з ёю рабіць?

— Усёроўна,—адказаў чорт, утупіўшыся носам у стол.

— Тады мы з першай партыяй адправім яе ў рай,—параіў другі анёл.

— Усёроўна,—зноў прамовіла жанчына і ўвайшла ў браму.

Падышоў нейкі рабочы.

— Чаму-ж ты зьлез тут? Табе-ж трэба было проста ехаць.

— Ды не, гэта памылка!..—пачаў быў ён даводзіць.

— Не, не, ідзі назад на станцыю!—рашуча сказалі чэрці.

— Эге!—сказаў Янка Юрку.—Хоць яны і выглядаюць соннымі, але сочаць добра. Мусіць, нам ня ўдасца прабрацца туды.

— Паглядзім,—спакойна прамовіў Юрка.

Падышоў нейкі тоўсты пан. Анёл хацеў быў яго прапусьціць, але чорт стаў пярэчыць.

— Як-жа ж гэта? Тут, напісана «забойства»,—значыцца, без перасадкі.

— Але-ж прачытайце далей,—паказаў анёл,—там сказана, што ня сам ён забіў, а праз другога.

— Ну, гэта адзін чорт!—умяшаўся другі чорт.

— Тое ды ня тое,—сказаў другі анёл.

Пачаліся спрэчкі.

— Дазвольце вам сказаць,—пачаў тады пан,—што за мяне ўжо заказана 40 мэс [1]).

— Пра гэта тут нічога ня сказана,—не згаджаліся чэрці.

— Тады запытайцеся.

Анёл зараз-жа падышоў да тэлефона:

— Алё! Гаворыць чысьцец. Хто ў тэлефона? Пётра. Дык вось тут у нас непаразуменьне. Пан Зарэмба кажа, што за яго заказана 40 мэсаў, але ў дакуманце аб гэтым ня сказана. Што? Спазьніліся? А як цяпер? Лічыць? Добра.

— Ну, дык вось,—зьвярнуўся ён да чорта,—сказана залічыць мэсы.

— Мала што ў вас там кажуць!—не згаджаўся чорт.—Павінна быць усё па закону. У дакуманце ня сказана—і канец! Зараз мы запытаемся ў свайго начальства.

Ён падышоў да другога тэлефона:

— Алё! Гаворыць чысьцец. Што? Смаляны аддзел? Не, дайце канцылярыю Люцыпара. Канцылярыя? Гаворыць чысьцец. Пан Люцыпар? Вось тут у нас непаразуменьне: ці можна залічваць мэсы, аб якіх у дакуманце ня сказана. Пан Зарэмба. Што? К чорту? Так... так... Добра.

— Ну, што?—запыталіся анёлы.

---

[1]) Мэса—каталіцкае набажэнства.

— Сказалі, што хоць гэта і не па закону, але можна ўступіць, бо гэтага дабра і ў іх завоз. Тым болей, што цяпер шмат народу прэ з СССР.



Зараз мы запытаемся ў свайго начальства.

І шчасьлівы пан Зарэмба ўвайшоў у браму.

Падышоў той самы ксёндз, якога піонэры заўважылі ў вагоне. Анёл глянуў дакумант і саромліва зачырванеўся. Паглядзеў чорт і рашуча сказаў:

— Ну, гэтага ўжо не прапусьцім!

І анёлы на гэты раз не спрачаліся.

— Ведаеш што?—сказаў тады Юрка Янку.—Пойдзем мы лепш у бок ды перабярэмся праз плот. Ніхто там ня пільнуе; гэтыя цялепні ня сьцямяць.

Адышліся. Зараз-жа адзін аднаму стаў на плечы, узьлез на плот, працягнуў руку другому.

Толькі-што нарыхтаваліся саскочыць, глядзяць—бяжыць да іх ксёндз.

— Браточкі! Памажэце! Век за вас буду бога маліць!

Весела стала хлапцом.

— Давай паможам! Шкада нам ці што?

Абодва працягнулі рукі і мігам усьцягнулі ксяндза. Той на радасьцях нават падзякаваць забыўся.

Унутры чысьцец меў выгляд вялікай шахматнай дошкі. Усё яно было перасечана роўнымі, простымі дарожкамі, а па бакох стаялі хаткі, зробленыя ўсе на адзін капыл.

Па дарожках бадзялася шмат народу ў шэрым, доўгім адзеньні, але ўсе яны былі нібы сонныя мухі: ні сьмеху, ні жвавых рухаў, ні галоснай размовы. Ціш была такая, быццам нікога тут няма.

Вось на лаўцы сядзяць некалькі чалавек і пазяхаюць так, што нават нашыя піонэры ня вытрымалі і разявілі раты.

— Што, таварышы, робіце тут?—запыталіся хлопцы.

— Сядзім,—сказаў адзін і пазяхнуў так, ажно сківіцы хруснулі.

— Заўсёды так і сядзіцё-о-о?—пазяхнуў Юрка.

— Не, о-о... Часам ходзім.

— О-о...—пачаў пазяхаць Янка.—А болей што робіце-о-о?

— Нічо-о-о-о-га!

— Бяжым адсюль-о-о!—закрычаў Юрка—бо прападзем-о-о-о!

Шмат людзей было побач іх, але ніхто не пацікавіўся ня толькі запытацца пра што-небудзь нязвычайных гасьцей, але нават зірнуць на іх.

Піонэры падышлі яшчэ да аднаго чалавека, з выгляду больш паважанага і разумнага.

— За што вы сюды трапілі?

— Ня ведаю.

— Што рабілі ў жыцьці?

— Нічога-о-о!—пачаў пазяхаць чалавек.

— Затое і трапілі сюды?

— Не.

— Вы тут пакутуеце-о-о?

— Не-о-о!

— О-о... вам тут добра жывецца?

— Не.

— До-о-о-ўга вам тут трэба быць?

— Ня веда-о-о-ю!

Не дабіўшыся ад яго толку, пашлі хлопцы далей, увесь час пазяхаючы.

Заглянулі ў адну хату. Некалькі чалавек сядзяць і дрэмлюць, некалькі ляжаць, два ходзяць з кута ў кут, адзін насупроць аднаго.

Калі піонэры ўвайшлі, ніхто нават не зьвярнуў на іх увагі.

— Добры дзень!—прывіталіся піонэры.

— До-о-о-бры дзень!

— Што вы тут робіце?

— Ча-а-а-каем.

— Чаго чакаеце?

— Пакуль там, на зямлі, за нас адмоляцца-о-о.

— А вы самі ня мо-о-о-жаце маліцца?

— О-о... Гэта ад нас не залежыць.

— Хто-ж тады павінен маліцца-о-о?

— Ксяндзы-о-о...

— Вам тут вельмі нудна-о-о?

— О-о..., ня ведаем.

Раптам адчыніліся дзьверы, і ў хату ўвайшлі анёл з чортам. Перапалохаліся нашыя піонэры: зараз даведаюцца, што яны незаконна пралезьлі.

Але тыя трымалі ў руках сьпісы, у якія глядзелі, і хлапцоў не заўважылі.

Пачалі выклікаць па сьпісу:

— Озэф Шпунт!

— Я!

— Казіміра Заблоцкая!

— Я!

Такім чынам выклікалі з дзесятак чалавек.

— За вас ужо адмаліліся. Збірайцеся, зараз паедзеце ў рай.

Шчасьліўцы пачалі зьбірацца, але па тварах іх было відаць, што і цяпер ім усёроўна.

— А нас няма ў сьпісе?—неспадзявана запытаўся Янка, а Юрка, аж пабялеў ад страху.

— Каго?

— Янка Пук і Юрка Шыш,—адказаў Янка.

Анёл і чорт зноў прагледзелі сьпіс.

— Не яшчэ. Прыдзецца пачакаць.

Калі піонэры вышлі з хаты, дык так рагаталі, што нават уся зявота прашла.

— Хай іх з чысьцом!—казалі яны.—Ідзем лепш да пекла; там павінна быць цікавей.

І яны накіраваліся назад.

Па дарозе трапілі ў нейкі асобны квартал, які нават быў адгароджаны невялічкім плотам.

— Хто тут жыве?—запыталіся яны ў якогась чалавека, на выгляд беднага селяніна.

— А тыя, аб якіх няма каму маліцца,—адказаў той.

— Значыцца, вы тут век павінны жыць?

— А хто яго ведае? У кожным разе тут лепш, чымся на зямлі. Прынамсі, адпачыць можна. А ў рай хай сабе паны ідуць,—куды нам совацца за імі?—махнуў рукой селянін і пашоў далей.



Цягнік з грукатам падляцеў да станцыі.

Калі піонэры выходзілі з гэтага кварталу, яны сустрэлі партыю людзей, якіх анёл з чортам пераводзілі з таго ў гэтае аддзяленьне.

— Чаму вас сюды пераводзяць?

— Ды ў адных не хапіла грошай на царкоўныя малітвы, у другіх памерла радня, пра трэціх забылася ці адмовілася заказваць набажэнствы і г. д.

Праз поўгадзіны піонэры былі ўжо на станцыі і чакалі наступнага цягніка.

А яшчэ праз некалькі гадзін яны з грукатам падляцелі да станцыі, на якой вогненымі літарамі было напісана: «пекла».

## V. НА ПАРОЗЕ ДА ПЕКЛА.

Станцыя была вялікая і шумлівая. Аказваецца, што, апрача гэтай дарогі, сюды ішло яшчэ некалькі з другога боку зямлі: з Амэрыкі, Афрыкі, Аўстраліі. Гэтага ў нас нават і ня ведаюць.

Дый зразумела, бо ўсе нашыя веды атрыманы ад тых падарожнікаў, якія езьдзілі па старой адзінай дарозе, з Эўропы, ды яшчэ сотні і тысячы гадоў назад. А цяпер шляхі зносін ужо зусім ня тыя.

Нават ужо распрацован проект аб пераходзе цалкам на электрычную цягу.

На станцыі таўклося шмат народу. Кожны стараўся адцягнуць хоць крыху той момант, калі прыдзецца пераступіць парог пекла.

Некаторыя нават панапіваліся з гора. Як і на кожнай добрай станцыі, тут таксама быў буфэт. Бутлі дэнатураванага сьпірытусу займалі ўсю сьцяну, самагон «пярвак», настоены на махорцы, стаяў цэлымі бочкамі.

Галоўнай закускай былі жабы, гатаваныя, смажаныя, марынаваныя, а для загранічных паноў—аматараў, нават жывыя, у банках. Зьмеі, яшчаркі, кракадзілы розных парод і гатункаў. Абмакнуўшы такі кавалак у чортаву перачніцу, аматары казалі, што да самагону гэта найлепшая закуска. Замест цукерак былі гарачыя вугалёчкі, якімі асабліва любілі ласавацца чэрці.

За станцыяй ішла вялізная плошча, якую лепш было назваць пячорай, бо навакол былі суцэльныя сьцены, скалы. Усё было чорнае; электрычныя лямпы толькі праразалі гэтую цемру, а не асьвятлялі.

Насупроць была вялізная, глыбокая брама, па-над якой зьзялі вогненыя літары:

*«Пакінь надзею назаўсёды, сюды ўвайшоўшы»* [1]).

Нават у піонэраў ёкнула сэрца, калі яны прачыталі гэтыя жудасныя словы, а некаторыя з публікі дык зусім самлелі.

Зразумела,—ля брамы—камісія, але ўжо з адных чарцей, ды не аблезлых, а страшных. Пераглядзеўшы дакуманты ды свае сьпісы, яны прызначалі кожнага ў адпаведнае аддзяленьне, а другія чэрці зараз насаджвалі іх на вілы і цягнулі ў сярэдзіну.

Вось падыходзіць рабін, той, які ехаў з піонэрамі ў вагоне.

— Імя?—запытаўся паважны лысы чорт.

— Нохім. Нохім Зібіцкер, са Смалявіч,—адказаў рабін.

Чорт паглядзеў у сьпіс і пакруціў галавой.

— Можа Нохім-Хаім?

— Не, паночку, Нохім.

Паглядзеў другі чорт, круглы, у акулярах, з пяром за вухам.

---

[1]) Гэты надпіс бачыла шмат людзей, і вы знойдзеце аб гэтым і ў гісторыі, і ў літаратуры.

— Няма такога. Ёсьць толькі Нохім-Хаім Зібіцкер і якраз са Смалявіч.

— Вось ад гэтага Хаіма і ўся бяда,—загаварыў рабін.—Яго прыпісалі да мяне пазьней, ён нарабіў бяды, а праз яго і я цяпер павінен цярпець. Вось гляньце: спачатку было толькі Нохім, а потым дадалі ўжо Хаім.

— Праўда,—згадзіліся чэрці.—Ну, ідзі назад, у галоўную канцылярыю, там хай разьбяруцца,—і яны паставілі на дакуманце адпаведную пячатку, каб яго прапусьцілі назад.

Рабін радасна ўсьміхнуўся і борзьдзенька пабег назад.

Зазваніў тэлефон. Чорт узяў трубку.

— Адкуль? Стыкс? Ну, ну! Што!? Харон? Забаставаў? Што за глупства! Ну, ну; так, добра. Званеце да пана Люцыпара.

— Вось дык гісторыя!—зьвярнуўся ён да сваіх.—Стары Харон забаставаў! Кажа, што ён мае права адпачынку на 2.650 год. Дзівота! Але, між намі, кажучы, я нічога ня маю супроць гэтага: прынамсі, і мы тады крыху адпачнем.

І яны зноў прыняліся за работу.

Прыходзіць адзін чалавек і кажа:

— Прапусьцеце і мяне.

— Ты хто будзеш?

— Цыбульскі Вацлаў. Парабак з-пад Слуцку.

— Няма такога,—адказалі, глянуўшы ў сьпіс.

— Вось мае дакуманты.

Зірнулі чэрці на дакумант і зарагаталі так, што сьцены затрасьліся.

— Ты-ж павінен быць у чысцу!

— Я быў там, ды ўцёк. Прымеце, калі ласка, у пекла.

Зноў зарагаталі ўсе, як чэрці.

— Чаму? Тут-жа ж пакута!

— Ну, а там яшчэ горшая пакута. Туляйся, сядзі ды пазяхай увесь век. Ніякай табе працы, ніякага інтарэсу.

— Малайчына, хлапец!—сказаў чорт у акулярах.—Але ці маем мы права прымаць такіх? Ніколі ня было такога выпадку.

Пазванілі ў чысьцец, але там толькі адказалі:—як хочаце, нам усёроўна.

Пазванілі на неба. Сьвяты Пётра адказаў:

— Можаце браць гэтага дурня сабе, у нас і сваіх досыць. Баба з воза—возу лягчэй.

— Ну, ідзі,—сказаў чорт.—Як добраахвотніку, мы табе дамо самую лёгкую працу: стоража пры школе.

Дайшла чарга да нашых піонэраў. Падышлі з жахам, назвалі сябе.

— Няма яшчэ такіх. Прыдзецца пачакаць,—адказалі ім.

— Ды мы жывыя!

— Што- Жывыя?!—падскочылі чэрці.—Ды як-жа ж вы сюды трапілі?



Цэрбэр! Прэч!

— Прышлі пазнаёміцца з вамі, паглядзець, што тут у вас робіцца, наведаць нашых.

— Вось так штука!—паскроб патыліцу лысы чорт.—Што-ж цяпер нам з імі рабіць? Дакуманты ёсьць?

— Вось піонэрскія білеты.

Паглядзелі на білеты, паціскалі плячыма, а потым круглы чорт і кажа:

— Але-ж чым чорт не жартуе? Давайце прапусьцім іх. Хлапцы слаўныя, вясёлыя.

— Ну, добра,—згадзіўся лысы чорт, узяў білеты і паставіў на іх штампы: «Дазваляецца вольны ўваход і выхад ва ўсіх аддзяленьнях».

— Глядзеце толькі, не трапляйце на вочы Люцыпару: уляціць тады ўсім,—дадаў ён, зварачаючы білеты.

Ледзь толькі піонэры ўвайшлі ў браму, як на іх кінуўся страшэнны жоўты сабака. Ён меў цэлых тры галавы, а замест хваста—жывая зьмяя! Перад такім страшыдлам нават піонэры зьбялелі.

— Цэрбэр! Прэч! Нельга!—крыкнуў лысы чорт. Сабака забурчэў сваімі трыма галовамі і неахвотна адышоўся.

— Ну, а цяпер можаце ісьці спакойна,—сказаў ласкавы чорт.—Бачыце, пасьля таго, як яго злавіў быў грэцкі герой Геркулес, ды вынес быў на зямлю,—пасьля гэтага Цэрбэр асабліва ня любіць жывых людзей.

Піонэры падзякавалі і пераступілі парог пекла.

А ззаду зьзялі словы: «Пакінь надзею назаўсёды...»

## VI. ПЕКЛА.

Першай установай, куды трапілі піонэры, была школа. У ёй навучаліся закону божаму ўсе тыя, хто на зямлі не хацеў ці ня мог вучыцца. Праўду кажучы, гэта была ня школа, а цэлы унівэрсытэт, у якім навучаліся шмат мільёнаў народу.

Настаўнік—чорт у акулярах—стаяў на катэдры і выкладаў:

— У першы дзень бог стварыў сьвет, у другі—неба, у трэці—ваду і зямлю, у чацьверты—сонца, месяц і зоркі, у пяты—рыб і птушак, у шосты—жывёл і чалавека. Ну, дык калі бог стварыў казла?—зьвярнуўся ён да аднаго вучня, па выгляду нейкага бухгальтара.

Той ускочыў і пралепятаў:

— У пя... пяты!

— Няпраўда!—загрымеў настаўнік.—Давай лапу.

Вучань працягнуў руку.

— Лінейку!—закамандаваў чорт.

Падбег чалавек і падаў гарачую жалезную лінейку.

— Цыбульскі!—ускрыкнулі піонэры.

Сапраўды, гэта быў Цыбульскі Вацлаў, той, што ўцёк з чысьцілішча і якога прызначылі сторажам пры школе.

Чорт узяў лінейку і адлічыў дзесяць udараў.

— Калі бог стварыў чорта?—запытаўся ён другога.

— У шосты!—упэўнена адказаў той.

— Дай лапу!

Потым ён зьвярнуўся да аднаго паважнага чалавека з пытаньнем:

— Да каго падобны чорт?

Чалавек устаў, і піонэры пазналі ў ім... профэсара! Таго самага профэсара, які так дужа ім дапамог. Піонэры гатовы былі-б нават падказаць яму, каб самі ведалі закон божы.

— Да бога,—адказаў профэсар.

Чорт здаволена ўсьміхнуўся.

— Чаму?—запытаўся ён далей.

— Таму, што бог стварыў яго па свайму падабенству, разам з анёламі.

— Правільна! А калі бог стварыў сонца?

— У першы дзень.

— Няпраўда! Стаць на калены! Цыбульскі!.. Гароху!

Прыбег Цыбульскі і прынёс «гароху»—распаленых да бяла каменчыкаў. І профэсар стаў каленамі на гэты «гарох», у кутку ля сьцяны.

У піонэраў зашчамела сэрца, і яны са сьлязьмі ў вачох пашлі да другога пакою.

Там на сьцяне былі паразьвешаны абразы, і настаўнік-чорт выклікаў:

— Пакажы сьвятога Пуда? Няпраўда! Лапу!

— Калі нарадзіўся сьвяты Мікола? Няпраўда! Стань на калены на рабро лаўкі!

Далей ішло вывучэньне царкоўных рэчаў, ляборатрыі па вывучэньню машчэй ды інш.

Урэшце, піонэры зьвярнуліся да аднаго настаўніка з запытаньнем:

— Скажэце, калі ласка, ці даўно вы так займаецеся?

— Заўсёды!

— Як так?

— Ды так. Вось ужо 1929 год я не адыходжу ні на хвіліну ад гэтай катэдры. Раней яшчэ выпадалі вольныя хвіліны, перапынак, а цяпер усё горш ды горш. Нават вучням мы прымушаны даваць перапынак, а сабе не, бо прыходзіцца аднаму працаваць у некалькіх клясах з мільёнамі народу.

— А ці прыходзіла вам да галавы думка,—сур'ёзна сказаў Янка,—што вы ня менш ад іх пакутуеце?

— Нават больш,—уздыхнуў чорт.—Але нічога ня зробіш,—кожны павінен выконваць свой абавязак. Раней яшчэ прыходзілася выходзіць на сьвет, пашвэндацца, пажартаваць з людзьмі, а цяпер няма часу, і мы нічога ня ведаем, што там робіцца.

— А вось кіньце працу на хвіліну, зьбярэцеся ўсе разам—мы вам і раскажам.

— З вялікай ахвотай,—сказаў чорт і зноў прыняўся за працу.

Далей трапілі яны ў бібліотэку, дзе павінны былі чытаць сьвятыя кнігі тыя людзі, якія ў жыцьці імі ня цікавіліся. Некалькі мільёнаў народу моўчкі сядзелі за кнігамі, а бібліотэкары з бізунамі наглядалі, каб яны чыталі.

— Ваша пакута яшчэ нішто сабе,—заўважыў Юрка аднаму чытачу.

— А праваліся яна к чорту!—злосна адказаў той.—Вы ня ведаеце яшчэ, што гэта за няшчасьце! Некаторыя з нас нават прасіліся перавесьціся на агонь, ды ня пушчаюць. О, гэта-ж самая страшная пакута!

Далей яны ўвашлі ў нібы царкву. На катэдры стаяў сапраўдны поп і гаварыў казаньне. Побач стаяў чорт.

— А гэта што такое?—зьдзівіліся піонэры.

— Гэта тыя, што ня любілі хадзіць у царкву,—лагодна растлумачыў чорт.—Дык вось мы адразу двух зайцоў дабіваем: і поп пакутуе, і яны.

— Мусіць і тут ня лепш, чымся ў чытальні,—разважалі піонэры, выходзячы з царквы.

На дзядзінцу між унівэрсытэтам і наступным памяшканьнем піонэры ўбачылі гурток людзей, якія хадзілі і чагосьці шукалі.

— Глянь, колькі тут нашых!—радасна сказаў Юрка.—А вось і дзядзька Рыгор! Дзядзька, што вы тут робіце?

— О, сыночак! Шукаем свае пазногці. Ня зьбіралі мы іх, выкідалі, вось цяпер і шукаем увесь век!

А побач стаяў чорт у капялюшы, зробленым з... гэтых самых пазногцяў!

— Шукайце, шукайце! Чаго сталі?—пакрыкваў ён злосна і насьмешліва.

Піонэры прайшлі ў другое аддзяленьне, якое мела выгляд нібы вялікай кухні. Наколькі магло абхапіць вока, цягнуліся шэрагі пліт, на іх стаялі патэльні, ля кожнай з іх стаялі людзі, галоўным чынам, жанчыны, нешта перакрыкваліся і час-ад-часу нахіляліся да патэльняў.

Зразумела, паміж імі хадзілі чэрці-даглядчыкі.

Нашы хлапцы спачатку нічога не маглі зразумець, потым прыгледзеліся і заўважылі, што людзі нахіляюцца... каб лізнуць гарачыя патэльні!

Тады яны ўразумелі, у чым справа, бо часта чулі аб гэтым дома.

— А ты ў Сідарыхі яйка з-пад курыцы ўкрала!—сказала адна жанчына сваёй суседцы і зараз-жа схілілася, каб лізнуць патэльню.

— Чыя-б карова рыкала, а твая-б маўчала!—адказала тая і лізнула патэльню.

— Маўчы, шлюха!—чуліся галасы далей.

Сярод іх быў і адзін хлопчык гадоў дзесяці.

— А ты за што?—спыталіся яго піонэры.

— Я плёваўся,—адказаў той праз сьлёзы і лізнуў патэльню.

Вось і мужчына, які лаяўся, ён таксама кожную хвіліну лізаў патэльню.

Піонэры заўважылі, што пад плітамі зусім няма агню і запыталіся аб гэтым чорта.

— Пліты электрычныя,—адказаў той, усьміхаючыся.—Вы думаеце, мы маглі-б справіцца звычайным спосабам? Тады-б на адно гэта аддзяленьне не хапіла-б усіх чарцей, а цяпер я адзін спраўляюся з 20.000.000 чалавек.

Далей сядзелі за сталом людзі галодныя, з прагавітымі вачыма; перад іх носам стаялі розныя смачныя стравы, але, як толькі яны нахіляліся, зараз-жа аўтоматычна падымаўся абух і—стук па лобе.

— Гэта абжэры,—растлумачыў адпаведны чорт.—Палюбуйцеся абсталяваньнем! Як у Форда! Дзякуючы гэтаму 5.000 чарцей можна было перакінуць на іншую працу!

— Значыцца, вы цяпер маеце больш вольнага часу?—сказалі хлопцы.

— Дзе там!—сумна адказаў чорт.—Усёроўна рабочых не хапае, а работа ўсё павялічваецца. 2.750 год ня выходжу я з гэтага памяшканьня.

— Дзіўная рэч,—сказаў Юрка Янку, калі яны адышліся далей.—Я пачынаю шкадаваць больш гэтых няшчасных чарцей, чымся пакутнікаў. Тыя, прынамсі, заслужылі сваю пакуту, а гэтыя завошта працуюць без перапынку?

— І я так думаю—уздыхнуў Янка.

Далей ішлі тыя, якія ў пост елі мяса. За гэта тут ім гвалтоўна пхаюць у рот сабачае, жаб'е, зьмяінае, пацуковае і іншае мяса.

— Раней на аднаго такога грэшніка,—тлумачыў чорт,—трэба было двух чарцей: адзін трымаў за галаву, а другі пхаў, а цяпер—гляньце, якая любата!

І сапраўды—любата: грэшнікі ляжалі на сталох, моцна прывязаныя, а машыны аўтоматычна і бязупынна пхалі ім у рот мяса; яно выходзіла праз другі канец, там падхапляла другая машына, перадавала першай,—ды зноў пачыналася спачатку.

— Гэта мы запазычылі з Чыкага, з вядомых чыкагскіх бойняў,—дадаў чорт.

Далей былі начэплены языкамі на крукі ашуканцы, манюкі, і машыны іх аўтоматычна трасьлі.

— Скажэце, калі ласка,—зьвярнуліся піонэры да аднаго ціхага чорта,—ці маеце вы самі на іх злосьць?

— Якая там злосьць?—сумна сказаў чорт.—Што нам да іх? Нам яны нічога дрэннага не зрабілі. Але прыходзіцца працаваць, бо прымушаюць.

— Хто?

— Вядома, начальства.

— А вы кіньце гэтую працу.

— Ну, не. Тады так пападзе, што сваіх не пазнаеш!

— А вы разам усе.

— Дык мы-ж ніколі адзін аднаго ня бачым! Мы-ж па тысячы год з месца зыйсьці ня можам!—безнадзейна сказаў чорт.

Потым яны ўвайшлі ў адно аддзяленьне, дзе было шмат вялізных казаноў, бакаў. У іх кіпела вада, зьверху ішоў жолаб, а па ім сыпаліся ў ваду... маленькія дзеці! Асобныя падважнікі перамешвалі іх у вадзе.

— А іх-жа ж завошта вы мучыце?—са сьлязьмі зьвярнуліся піонэры да старэнькага сумнага чорта, які кіраваў працай.

— Няхрышчоныя яны, дык вось хрысьцім,—хмура адказаў той.

— Ці-ж яны вінны?

Чорт горка ўсьміхнуўся:

— А ці-ж вы ня ведаеце, што гэта закон боскі, а ня мой? Наша справа маленькая: стой тут увесь век ды перамешвай гэтых няшчасных нявінных дзяцей.

І ён адвярнуўся, каб выцерці сьлязіну. Кулакі піонэраў таксама палезьлі ў вочы...

— Паверыце,—сказаў далей чорт,—паўтары тысячы год прашуся, каб мяне прыставілі да якіх-небудзь зладзеяў, але ўсё кажуць, што нельга, рабочых не хапае. Часамі згадзіўся-б лепш сам ускочыць у вар, чымся бачыць усё гэта, але, як вядома, нас аніякі чорт не бярэ. Эх, каб якое-небудзь вызваленьне прыйшло нарэшце! А тут усё сыпяцца нейкія акцябраты з СССР.

Разжаленыя піонэры пацiснулі чорту лапу і сказалі:

— Пачакай, дзядзька, прыдзе канец і вашай няволі.

— У добры час,—адказаў ён весялей:—Калі што, дык я першы к самому чорту на рогі палезу.

Чым далей, тым усё болей і болей пекла прымала выгляд вялізарнага заводу. Грукацелі машыны, сіпелі пасы, круціліся колы.

Але ўсюды было мала рабочых. Адзін чорт абслугоўваў дзесяткі і сотні машын і насіўся, як Марка па пеклу, ад машыны да машыны.

— Як ты думаеш,—сказаў Юрка Янку:—хто ад каго пераняў такую сыстэму, ці Форд ад чорта, ці чэрці ад Форда?

— Я думаю чэрці, бо дагэтуль ніхто з падарожнікаў ня бачыў у пекле аніякай індустрыялізацыі.

Вось шэрагі людзей, сярод якіх круцяцца колы з вострымі зуб'ямі і вырываюць кавалкі мяса. Гэта—зладзеі.

Там нейкіх грэшнікаў пілуюць, габлююць машынамі, там гладзяць па сьпіне гарачым жалезам і г. д., і г. д., без канца.

Але самым галоўным аддзяленьнем у пекле лічыцца «Смаляны аддзел». Там кіпяць у смале самыя горшыя грэшнікі: забойцы, бандыты, гвалтаўнікі ды інш. Туды часамі, як на зямлі ў карцар, саджа-

юць на некаторы час і з другіх аддзяленьняў. Сюды нават і чарцей-рабочых пераводзяць для кары.

Смурод ад смалы і серкі, гарачыня, духата. Гэта вытворчасьць ужо па сваіх уласьцівасьцях цяжэй за ўсіх паддаецца машынізацыі.



Грукацелі машыны, сіпелі пасы, круціліся колы.

— Вы тут таксама ня маеце аніводнай хвіліны адпачынку?— запыталіся піонэры.

— Які тут, чорт, адпачынак!—адказаў замызганы потны чорт.

— А ў нас на такіх, асабліва шкадлівых прадпрыемствах, працуюць яшчэ меней, чымся на другіх!

— Колькі-ж?

— Гадзін шэсьць, а то і чатыры.

— А рэшта?

— А рэшта—вольныя.

— Як-жа ж так?—зьдзівіліся чэрці.—Гадзін дваццаць у суткі зусім вольныя?

— Але.

Гэтыя весткі перадаліся адзін аднаму, чэрці прыпынілі працу і абкружылі піонэраў.

— Дзе, дзе гэта так?—пыталіся з розных бакоў.

— У СССР.

— Ня можа быць!—сказаў адзін цьвілы чорт:—Ці-ж можна гуляць 20 гадзін у суткі, калі я, напрыклад, меў тры гадзіны за 6.400 год!

— Ці вы добра знаёмы з тым, што робіцца на зямлі?—запыталіся піонэры.

— Дзе там! Зусім нічога ня ведаем, бо даўно ўжо нас не выпускаюць. Я, напрыклад, апошні раз быў на зямлі і спалохаў бабу 1.356 год назад, дый то выскачыў на адну толькі хвіліну.

— Дык вось, чым тлумачыцца тое, што цяпер на зямлі ніхто ня бачыць чарцей, у той час, калі раней гэта было на кожным кроку!—сказаў Янка.

— Зразумела, гэтым!—пацьвердзілі чэрці.

— Калі так,—сказалі піонэры,—спынеце працу, сабярэцеся разам, а мы вам раскажам, што робіцца на сьвеце.

— Добра, добра,—загулі чэрці.—Перапынак! зьбірайцеся!

## VII. ГАРМІДАР У ПЕКЛЕ.

З усіх аддзяленьняў паваліл чэрці, каб паслухаць навіны з зямлі, ды яшчэ ад жывых, непадлеглых ім людзей.

Сталі машыны, спыніліся заняткі.

Грэшнікі павылазілі з машыны, смаляных казаноў і радасна адпачывалі ад сваёй пакуты.

Піонэраў паставілі на нейкую машыну, каб усім можна было відаць і чуць іх.

— Таварышы!—пачаў Янка звонкім голасам.—Прышлі мы з зямлі, каб паглядзець, як пакутуюць нашыя браты, каб пашукаць якога-небудзь спосабу дапамагчы ім. Прышлі да чарцей, пра якіх нам кажуць, што гэта ёсьць самыя лютыя стварэньні, якія толькі і думаюць, каб памардаваць людзей.

— Няпраўда!—пачуліся галасы.—Нам усёроўна. Ня нам яны зрабілі дрэнна. Але нас прымушаюць працаваць, згодна загаду бога.

— Вось мы і самі гэта заўважылі,—казаў далей Янка.—Мы знайшлі, што вы самі зьяўляецеся такімі самымі пакутнікамі, як і вашыя грэшнікі.

— Правільна! Нават горшымі!—загулі чэрці.

— А ці падумалі вы хоць раз: чаму і дзеля чаго вы працуеце?—крыкнуў Янка.

Чэрці неўразуменна паглядзелі адзін на аднаго і ня ведалі, што адказаць.

— Так трэба! Кожны павінен працаваць,—адказалі некаторыя.

— А каму гэта трэба?—грозна запытаўся Янка.

Чэрці маўчалі.

У Янкі не хапіла голасу, і ён уступіў месца Юрку.

— Ну, дык мы вам скажам, чаму і дзеля каго гэта трэба,—пачаў далей Юрка.

— Калі ласка, просім!

— Вы-ж лічыцеся супрацiўнікамі, ворагамі бога. Так, ці не?—запытаўся Юрка.

— Вядома! Спрадвеку!—адказалі чэрці.

— Ну, дык завошта вы мардуеце тых людзей, якія разам з вамі таксама ідуць супроць бога? Вы-б павінны былі любіць, шанаваць іх, а не мардаваць. А вы, выбачайце, як дурні, мардуеце сваіх братоў, ворагаў свайго ворага. Ён сабе спакойна сьпіць, а вы на яго працуеце. Вашымі рукамі ён сабе абараняе спакой.

— Дык гэта-ж спрадвеку было!—пачуліся няпэўныя галасы.

— Мала што спрадвеку. Спрадвеку вы працавалі рукамі, а цяпер перайшлі на машыны. Кожны робіць так, каб было лепей, а ня горш.

— Дый сам Люцыпар загадвае нам працаваць.

— А сам ён што робіць?

— Ды нічога,—адазваўся доўгі худы чорт. Сядзіць сабе ў залатых палацах ды гуляе! Нават ані разу сюды ня глянуў.

— Ну, вось бачыце! А сам ён з богам змагаецца? Ці спрабаваў ён зводьніць ад пакуты, прынамсі тых людзей, якія на зямлі нічога дрэннага не рабілі, апрача вайны з богам? Ці спрабаваў ён зводьніць ад пакуты нявінных няхрышчоных дзяцей, якія яму павінны быць мілы?

— Не,—хорам адказалі чэрці,—з богам яны згодна жывуць, ніякіх конфліктаў за апошнія тысячагодзьдзі ня было.

— А па-мойму, дык абодва яны—адзін чорт!—крыкнуў нейкі смалены чорт.

— Праўда, таварышы!—падхапіў Янка.—Абова яны нічога ня робяць, абодва сядзяць у пышных палацах, абодва прымушаюць вас вечна працаваць, абараняць іх ад людзей. Вось на каго вы працуеце!

— Правільна! Далоў іх!—грозна загула чартаўня.

— І ў нас таксама было,—казаў Янка.—Быў у нас цар, наш Люцыпар, і таксама нібы змагаўся з другім царом, а сапраўды—абодва яны былі змовіліся і думалі толькі аб тым, каб працоўных у сваіх руках

трымаць. Ну, мы ўзялі і зьнішчылі свайго цара ды самі зрабіліся гаспадарамі. Вось чаму цяпер у нас працаваць лягчэй, працуем ужо самі для сябе, а не для другога. Але нідзе ў нас, нават пры царох, ня было такога пекла для рабочых, як у вас тут. Каб у нас прымусілі працаваць так, як вы працуеце, тады-б праз хвіліну разьнесьлі-б усіх гаспадароў, а вы церпіце, ды яшчэ называецеся чарцямі.

Загуло пекла, забушавала. Уся тысячагадовая крыўда ўсплыла наповерх. Крыўдна стала за сваё чартоўскае, беспрасьветнае жыцьцё.

Выскачыў смалены чорт і закрычаў гаспадарскім голасам:

— Таварышы! Годзе, будзе цярпець! Дзеля каго мы нясём такую чартоўскую працу? На чорта гэта нам здалося? Каму ад гэтага карысьць? Толькі богу, Люцыпару ды іх паслугачым. І дзеля іх мы мардуем столькі людзей, з якіх прынамсі палову мы можам лічыць сваімі братамі, такімі самымі рабочымі, як мы самі. Ці ня лепш было-б аб'яднацца з імі ды прагнаць к чорту ўсіх нашых паноў?..

Далейшых слоў ужо нельга было чуць, бо падняўся такі чартоўскі шум, што ў піонэраў у вушох зазьвінела.

— Досыць ужо! Папілі нашай крыві! Тысячы год трымалі нас за рабоў!—чулася сярод гэтага гулу.

Нават грэшнікі далучыліся і крычалі, як чэрці.

Тады выступіў адзін з грэшнікаў, быўшы рабочы.

— Таварышы! Зірнеце вакол, прыглядзьцеся да тых, каго вы да гэтага часу мардавалі. Ці знойдзеце вы тут паноў, памешчыкаў, капіталістых? Мусіць, на ўвесь шматмільённы аддзел знойдзецца адзіндва. Рэшта ўсё працоўны народ, такі самы, як і вы. А багатыя жывуць у раі, бо маюць грошы, каб наняць папоў, ксяндзоў, рабінаў і г. д. А тут адны працоўныя мардуюць другіх. Акурат таксама адбываецца на зямлі: адны працоўныя стаяць ля варштатаў, а другія, такія самыя, толькі ўзброеныя, пільнуюць, каб яны не паўсталі супроць багатых. Бачыце, як хітра ўсё гэта пабудована?

— Так, так! Правільна! Цяпер не ашукаюць! Зразумелі ўжо!—гулі чэрці.

Потым пачалося братаньне чарцей з грэшнікамі, абнімаліся, цалаваліся, нават плакалі ад радасьці.

Стары чорт прывёў цэлыя атрады акцябрат і піонэраў, якіх ён нядаўна «хрысьціў». Адзін акцябронак ужо ўзабраўся на трыбуну і зьвінеў:

— Дзядзенькі! Дзякуем мы вам, што вы нас аслабанілі. З гэтага часу мы будзем добрымі, паслухмянымі, ня будзем біцца, лаяцца.

Ад гэтых слоў разьмякчэлі нават самыя заядлыя чэрці.

— Бедныя дзеткі! Яны думаюць, што іх за тэтае каралі. Яны нават ня ведаюць, што іх каралі толькі за тое, што яны няхрышчоныя!—казалі яны, выціраючы сьлёзы.

Ускочыў яшчэ адзін з грэшнікаў:

— Таварышы! Усе за аднаго, адзін за ўсіх! Мы ўсе павінны аб'яднацца!..




**Досыць ужо! Папілі нашай крыві!**

— З табой?!—перарваў яго смалены чорт.—Ах, ты, бандыт! Ты тутака прычым? Таварышы! Гэты бандыт зарэзаў дзьве бедных сялянскіх сям'і і прапануе з ім аб'яднацца. Ці можам мы...

— Далоў яго! Назад, у смалу!—закрычалі чэрці, мігам падхапілі яго на вілы і пасадзілі ў чан. Нарэшце, зноў выступіў Янка.

— Таварышы! Нам трэба дзейнічаць у парадку, арганізавана, бо ніякага толку ня выйдзе. Дзеля гэтага я прапаную:

1) абраць камітэт з сваіх рабочых ад варштату і слухацца яго, як сваёй вышэйшай улады,

2) зараз-жа расправіцца з Люцыпарам і яго прыхільнікамі і зьнішчыць іх назаўсёды, і

3) выпрацаваць констытуцыю, законы, па якіх вы пажадаеце ў далейшым існаваць.

— Добра! Згодны!—закрычалі чэрці.

Зараз-жа абралі камітэт, у які ўвайшло па адным прадстаўніку ад кожнага цэху (аддзяленьня) і ад грэшнікаў (не крымінальных). Старшынёю абралі смаленага чорта ад смалянога цэху, сакратаром—чорта лазатага з машыннага аддзяленьня.

Узброіліся, разьбіліся на атрады і з пяяньнем «Інтэрнацыяналу» рушыліся да палацу Люцыпара.

— Трэба выключыць тэлефоны,—сказалі хлопцы,—каб спыніць між імі сувязь.

— Малайцы, хлопцы! Хоць маленькія, а якія спрактыкаваныя!—пахваліў чорт лазаты і нават папляскаў іх па плячы.

Палац Люцыпара, пабудаваны з суцэльнага золата, знаходзіўся на высокай скале. Вакол скалы быў вогнены роў, а ў ім песьціўся зьмей, даўжынёй у некалькі кілёмэтраў.

— Глянь, глянь!—зацікавіўся Янка.—Той самы зьмей, якога малююць у цэрквах на абразох!

Люцыпар сядзеў у сваім залатым палацу і гуляў з вядзьмаркамі ў карты, калі прыбеглі спалоханыя міністры і сказалі, што чэрці-рабочыя ўзбунтаваліся.

Люцыпар спачатку не зразумеў, што тыя кажуць.

— Здурнелі вы, ці што?—прамовіў ён.—Супроць каго ім бунтаваць? Супроць бога мы-ж даўно бунтуем.

Прыбеглі новыя князі і крыкнулі:

— Ваша вялікасьць! Чэрці падняліся супроць вас! Пагражаюць зьнішчыць.

— А! Вось што?—зароў Люцыпар.—Сабрацца разам! Страляць у іх з гарматаў!

Зараз-жа вакол Люцыпара сабралася армія ў 72.000 чарцей. Пачалі страляць з граматаў.

Але што гэта былі за гарматы! Адзін сьмех.

Аднак, хлопцы вельмі зьдзівіліся, пачуўшы стрэлы.

— Адкуль у іх гарматы?

— Гэта, бачыце, тыя гарматы,—растлумачыў чорт лазаты,—якія засталіся яшчэ з часу вайны з богам, калі нас выганялі з раю. Дрэнныя, самыя першабытныя гарматы [1]).

---

[1]) Ёсьць яшчэ кніга славутага ангельскага поэты Мільтона (XVII стагодзьдзя)—„Страчаны рай“. У ёй якраз гаворыцца пра гэтую вайну і гарматы.

— А ў вас ёсьць?

— Няма,—зьбянтэжана адказаў чорт смалены.—Адкуль-жа ж нам іх узяць? Гэта-ж Люцыпарава справа.

— А ці хутка вы маглі-б зрабіць?

— Калі ведаць, што і як,—дык у некалькі хвілін. І нават лепшыя за гэтыя, бо ў нас цяпер ёсьць самыя дасканалыя машыны.

— Дык у вас-жа ж сярод пакутнікаў знаходзяцца самыя найлепшыя інжынэры ў сьвеце! Яны мігам наладзяць гэтую справу.

Праз некалькі хвілін дзесяць найлепшых сусьветных спэцыялістых выпрацавалі чарцяжы, а праз гадзіну 2.400 дасканалых гармат, самай апошняй сыстэмы, ужо грамілі крэпасьць Люцыпара.

Люцыпар толькі дзіву даваўся.

— Вось чэрці!—скрыгатаў ён зубамі.—Адкуль гэта ў іх узялося?

Хутка ўся крэпасьць была зруйнавана. Люцыпар і 600 апошніх яго прыхільнікаў былі ўзяты ў палон.

— Зьнішчыць іх усіх!—раўлі чэрці.

Запхнулі іх у самую вялікую печ, дадалі пораху, дынаміту і...

На зямлі ў гэты час адбылося вялікае землятрасеньне. Некалькі гарадоў было зруйнавана, шмат народу загінула. З вулькану вырваўся вялікі слуп дыму і агню: гэта вылецела і загінула ўлада Люцыпара...

## VIII. КОНСТЫТУЦЫЯ П. Е. К. Л-а.

Старая ўлада была зьнішчана. Засталося будаваць новы лад.

Камісія, у якую ўваходзіла шмат выдатных вучоных з людзей, хутка выпрацавала новы парадак.

Уся ўлада, зразумела, перайшла к Савету з прадстаўнікоў ад кожнага цэху і ад грэшнікаў.

Адразу-ж ухвалілі ўвесьці 7-гадзінны рабочы дзень, а ў смаляным цэху—4-гадзінны.

Вызвалілі ўсіх грэшнікаў, апрача зладзеяў, забойцаў, бандытаў. Але і ім пакута была ня вечная, а ў залежнасьці ад учынку—ад 1000 да 1.000.000 гадоў.

Галоўнай мэтай было пастаўлена—абслугоўваньне працоўных. Дзеля гэтага аднагалосна ўхвалена не мардаваць тых, каго накіроўвае бог, а толькі тых, каго засуджвае пролетарскі суд на зямлі.

З прычыны таго, што праца такім чынам скарацілася на 99 проц.,—рэшту цэхаў парашылі пераабсталяваць для больш карыснай вытворчасьці, для вырабу жалеза, медзі, золата і іншых карысных выкапняў, што людзі знаходзяць у зямлі. Пры гэтым пастаноўлена сачыць, каб гэтае багацьце не трапляла ў рукі капіталістых, а ішло выключна на карысьць працоўных.

Паміж іншым, вось чым тлумачыцца, чаму за апошні час здараюцца часта зямлятрасеньні, нават у такіх мясцох, дзе яны, здаецца, ніколі ня былі і не павінны быць: Крым, Адэса, Кіеў, Харкаў, Аўстрыя, ня кажучы ўжо аб Азіі, Каўказе. Гэта адбывалася перабсталяваньне пекла, рамонт; ну, а ў часе такой капітальнай працы, вядома, павінен быць грукат і трасеньне.

*
* *

Ня будзем апісваць, як зьвярнуліся нашыя піонэры дадому, якія провады наладзілі ім удзячныя чэрці. У кожным разе назад было лягчэй зьвярнуцца, чым трапіць туды.

Такім чынам, мы цяпер ведаем, што гэта за пекла, і як там жывуць чэрці ў сучасны момант, а ня тысячы год назад. Ня верыць гэтаму нельга, бо па-першае, Янка Пук і Юрка Шыш, як добрыя піонэры, маніць ня могуць, а па-другое, іх паведамленьне больш адпавядае розуму, чым паведамленьне нейкай там няпісьменнай Тэклі.

Я сам хацеў быў пайсьці паглядзець, але ня мог пралезьці у дуплё, бо дзірка для мяне аказалася замалая. Але хто танейшы, той лёгка трапіць. Трэба толькі добра памятаць дарогу: спачатку проста на поўнач, потым—направа, далей—налева, потым—зноў направа, тады—зноў налева, і, урэшце, яшчэ раз налева.



1964 –

Бел. [illegible]дзед
1994 г.

B000000273956 1